# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

9 ЛІПЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15772)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны



## Ларыса ГРЫБАЛЁВА:
# «МОЙ САКРЭТ — У НАТУРАЛЬНАСЦІ»

**Летась гэтая артыстка адзначала 20-годдзе творчай дзейнасці, але, пазнаёміўшыся з ёю, разумееш, што яна не страціла свайго запалу. Ларыса Грыбалёва — яркі прыклад чалавека, які ўмее сумяшчаць клопат пра сям'ю з любімай працай, не баіцца прымяраць новыя амплуа і — з надзеяй зрабіць больш, чым учора — чакае новага дня. Ці шкадуе яна пра нешта, чым ганарыцца і чаму лічыць, што жанчына павінна быць слабай, мы пацікавіліся падчас асабістай сустрэчы.**

**— Нядаўна выйшаў ваш кліп на песню «Забытае шчасце». Гісторыя ў нечым аўтабіяграфічная?**

— Задума была ў тым, каб паказаць усе настроі жанчыны. І не абавязкова ў нейкі няўдалы ці шчаслівы перыяд жыцця. Бо эмоцыі мы адчуваем штодзённа — радасць, нянавісць, разгубленасць, абыякавасць. Насамрэч, у кампазіцыі прысутнічае момант аўтабіяграфічнасці, таму што я такая ж жанчына, як і ўсе. Да матэрыялу заўсёды стаўлюся выбарачна і спяваю тое, што мне блізка, можа, таму ў мяне і не дзесяць альбомаў, а толькі два.

**— У красавіку вы паказалі сябе ў якасці тэатральнай актрысы. Такі вопыт — толькі эксперымент ці варта чакаць працягу?**

— Для мяне, як і для двух іншых удзельнікаў спектакля, — гэта эксперымент. Мы не акцёры і не збіраемся забіраць хлеб у сапраўдных прафесіяналаў. Для нас усё больш падобна да прыгоды, якая дазволіла паспрабаваць сябе ў іншай сферы і атрымаць карысны вопыт. Многія просяць паўтарыць зробленае. Аднак наконт працягу рашэнне павінны прымаць усе ўтраіх, таму пакуль не скажу нічога канкрэтнага. Сам спектакль з'явіўся пасля двухмесячнага рэпетыцыйнага працэсу і стаў вялікім эмацыянальным узрушэннем для мяне.

Звычайна, калі пастаноўка зроблена, то з ёй пачынаюць гастраліраваць альбо ставяць у тэатры нейкі час, але ў нас такой мэты не было. Калі мы і паўторым свой эксперымент, то гэта, верагодна, будуць нейкія гастролі «для сваіх» у Францыі ці яшчэ недзе. На паток ставіць такую працу не збіраемся.

**— Гераіня спектакля ў нечым падобная на вас?**

— Мне здаецца, што не, хаця кажуць, быццам у нас ёсць нешта агульнае. Мой персанаж — жанчына дзівакаватая, такія моманты ёсць у кожнай з нас, але ў спектаклі раскрываецца вобраз таго, якой яна павінна быць — той адзінай, якая запаўняе ўсё жыццё мужчыны і пра якую немагчыма забыцца, сустрэўшы аднойчы. І, мне падаецца, яе эмоцыі, паводзіны і вобраз наогул тут пададзены вельмі ўтрыравана. Усё ў ёй занадта...

**— У адносінах «мужчына і жанчына» вам важна адчуваць сябе слабай?**

— Думаю, як і любой жанчыне. Мне прыемна і спакойна, калі за мяне прымаюць рашэнні, калі я ведаю, што магу разлічваць на мужчынскую падтрымку і гатоўнасць прыйсці на дапамогу, як раптам спатрэбіцца. Безумоўна, здараюцца выпадкі, калі жанчына выходзіць на першую пазіцыю, але гэта часта не яе жаданне, а жыццёвая неабходнасць. Альбо часам некаторыя самі яе прыдумляюць. Трэба імкнуцца падаваць сябе так, каб мужчыны былі першымі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Смачна есці

# НА КУХНІ НЕ АБЫСЦІСЯ БЕЗ КРЭАТЫВУ

### І тады пакаштуем салодкі соус з бульбянога шалупіння

**У жніўні ў Бразіліі пройдзе чэмпіянат свету па прафесійным майстэрстве WorldSkills International, які збярэ больш як 1200 канкурсантаў з 63 краін. Студэнт III курса Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Мікіта ЦВЯТКОЎ на гэтых спаборніцтвах будзе абараняць гонар айчыннай сістэмы прафесійнай адукацыі ў намінацыі «Кухар». Пуцёўку на прэстыжны конкурс ён заваяваў падчас спаборніцтваў WorldSkills СНД у Казані. Там ён узяў «серабро». Таксама журы пахваліла Мікіту за афармленне страў, крэатыўнасць і лаканічнасць.**



## ШТО Ў ЧОРНЫХ СКРЫНЯХ?

— У Казані я атрымаў вельмі карысны досвед, — прызнаўся хлопец. — Умовы спаборніцтваў былі максімальна набліжаны да тых, што чакаюць нас у Бразіліі. За дзень да конкурсу нам адкрылі ўсе чорныя скрыні з прадуктамі і далі гадзіну, каб мы напісалі меню. Трэба было прыгатаваць страву з птушкі, тры гарніры і мінімум адзін соус. З гарніраў павінна было быць пюрэ, а з круп прысутнічала экзатычная для Беларусі кінуа — нешта накшталт празрыстых пацерак, якія лопаюцца на зубах, як ікрынкі. Таксама ў абавязковую праграму ўваходзіў мус з садавіны або дэсерт з яе ўтрыманнем. Плюс авалакта — закуска з выкарыстаннем яек і малака.

У першы дзень трэба было прыгатаваць тры стравы і чатыры — на наступны. На гэта адводзілася чатыры і пяць гадзін адпаведна. Мікіта так стараўся, што з усімі заданнямі справіўся датэрмінова. Дарэчы, па ўмовах конкурсу гэта не плюс, а, наадварот, мінус, за што ён і страціў тры балы. А да перамогі яму не хапіла ўсяго 1,39 бала. «Затое я навучыўся разлічваць свой час і ведаю, як распараджуся ім у Бразіліі, — усміхаецца ён. — Пры захаванні той жа хуткасці, што і ў Казані, я змагу зрабіць стравы больш складанымі і цікавымі».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Не вучобай адзінай

# СТУДЭНЦКАЕ ШЧАСЦЕ — ДАХ НАД ГАЛАВОЙ

### Ці трэба імкнуцца да 100-працэнтнай забяспечанасці інтэрнатамі?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Кожны першакурснік, які прыехаў вучыцца ў Мінск з іншага горада, скажа вам, што паступіць у сталічную ВНУ — толькі палова справы. Зусім шчаслівым чалавекам можна адчуць сябе ў тым выпадку, калі атрымаеш у студэнцкім інтэрнаце дах над галавой. Асабліва калі табе пашанцуе трапіць у Студэнцкую вёску...**

**Забеспячэнне студэнтаў жыллём заўсёды знаходзілася ў цэнтры ўвагі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Таму зусім невыпадкова апошняе пасяджэнне прэзідыума ЦК прафсаюза, прысвечанае маладзёжнай палітыцы, прайшло менавіта ў Студэнцкай вёсцы. Дарэчы, сёння тут заселена ўжо сем з васьмі запланаваных інтэрнатаў. Апошні, што зараз будуецца, прызначаецца для аспірантаў.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*